УДК 811.161'373.6

В. А. Кузьміч, заг. кафедры

# ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ АСОБЫ ЯК АСНОВА ІДЭАЛАГІЧНАГА ЗМЕСТУ ВУЧЭБНА-ВЫХАВАЎЧАГА ПРАЦЭСУ

The article is concerned with value oriented educational work in high school. Emphasis rests on such elements of upbringing process as civicism and patriotism. Experience of Belarusian language department of BSTU in practical realization of value oriented approach is analyzed here. Particularly, such a factors of civic and patriotic activity, as pedagogical cooperation of all participants of educational process, its content and actual filling, lecturer's personality and his or her civic attitudes. Basic universal values are formulated here that underlie an ideological content of upbringing process.

**Уводзіны.** Прыярытэтным напрамкам ідэалагічнай і выхаваўчай працы ў 2008/2009 вучэбным годзе ў вышэйшых навучальных установах застаецца грамадзянска-патрыятычнае выхаванне, накіраванае на засваенне агульначалавечых гуманістычных каштоўнасцей, культурных і духоўных традыцый, фарміраванне гатоўнасці да выканання грамадзянскага абавязку, патрэбы ў працы дзеля грамадскага дабрабыту.

Паняцце *грамадзянскасці* ўключае ў сябе гатоўнасць і здольнасць асобы актыўна ўдзельнічаць у справах грамадства і дзяржавы, усвядомлена карыстацца правамі, свабодамі, выконваць ускладзеныя абавязкі і грамадскія функцыі. У першую чаргу гэта законапаслухмянасць, патрыятычная адданасць, абарона інтарэсаў Радзімы, арыентацыя на духоўна-маральныя каштоўнасці ва ўсіх сферах жыцця. Як адзначае міністр адукацыі Беларусі А. М. Радзькоў, «наша задача – абапіраючыся на лепшыя ўзоры гісторыі, прапагандуючы іх, паказаць перавагу беларускага ладу жыцця, яго прымальнасць і прывабнасць для моладзі».

Галоўным элементам грамадзянскасці з'яўляецца *патрыятызм* як духоўна-маральнае пачуццё, якое праяўляецца ў клопаце аб інтарэсах краіны, гонары за яе дасягненні, павазе да гістарычнага мінулага Радзімы і яе традыцый.

**Асноўная частка.** Калектыў кафедры беларускай мовы, які неаднаразова канкрэтнымі справамі пацвярджаў свой высокі прафесіяналізм, творчую актыўнасць, адданасць роднай краіне, шчырасць і ідэйную перакананасць, з высокай адказнасцю ставіцца да грамадзянска-патрыятычнага выхавання моладзі. Асаблівая прадуктыўнасць працы кафедры дасягаецца дзякуючы педагагічнаму супрацоўніцтву ўсіх удзельнікаў выхаваўчага працэсу. У рэчышчы выканання дзяржаўных задач працуе творчае студэнцкае аб'яднанне «Пошук», прадстаўленае гурткамі «Памяць», «Спадчына», «Пазнай свой край», «Мая Радзіма – Беларусь», «Патрыёт», «Крыніца», «Выток», літаратурным клубам «Ветліца», якія спрыяюць выяўленню таленавітай моладзі і стымулююць яе да навуковай і творчай актыўнасці. Толькі за 2008 навучальны год удзельнікамі аб'яднання пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры праведзены канферэнцыі па наступнай тэматыцы: «Халакост: памяць і перасцярога», «Гісторыя маёй сям'і – адна са старонак шматвяковай гісторыі краіны», «Той люд жыве, што свае песні мае», «Язык и культура», «Вайна вачыма маладых». На рэспубліканскія конкурсы студэнцкіх навуковых прац прадстаўлена 31 работа і 5 – на міжнародныя. Іх тэматыка прысвечана выхаванню грамадзянскасці і патрыятызму, напрыклад: «Гістарычныя постаці Піншчыны», «Памяць людская ўсё зберагла» і інш.

Сённяшняя Беларусь мае патрэбу ў грамадзяніне-патрыёце, які найперш усведамляе сваю адказнасць за лёс Радзімы, ганарыцца яе мінулым, шануе нацыянальныя традыцыі. Разам са штодзённай працай па выхаванні патрыятызму асаблівую значнасць набываюць такія лёсавызначальныя падзеі, якія не ў праве забываць ніхто з нас. У 2008–2010 гг. адзначаецца 65-гадавіна вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25.02.2008 г. № 110 «Аб падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 65-й гадавіны вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне» быў створаны Рэспубліканскі арганізацыйны камітэт на чале з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкам. Згодна з Указам, зацверджаны план падрыхтоўкі і правядзення святкавання, на аснове якога Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь распрацаваны план мерапрыемстваў і даве-

дзены да ўсіх адукацыйных структур. У гэтым рэчышчы кафедра беларускай мовы распрацавала ўласнае ідэалагічнае напаўненне да гэтай знамянальнай даты. Святкаванне 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамога савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне – магутны стымул грамадзянска-патрыятычнай актыўнасці студэнцкай моладзі. Менавіта памяць пра цяжкія выпрабаванні Вялікай Айчыннай вайны, масавы гераізм савецкага народа на франтах і ў партызанскіх атрадах, яго самаахвярная праца ў тыле, масавае супраціўленне нацысцкаму рэжыму пакладзены за аснову творчага праекта «Вялікая Айчынная вайна вачыма маладых». Мэтай праекта з'яўляецца ўсведамленне моладдзю подзвігу савецкага народа ў змаганні супраць фашысцкай агрэсіі, асэнсаванне гістарычных этапаў умацавання беларускай незалежнасці і дзяржаўнасці. Ставілася задача выхавання грамадзян з высокай ідэалагічнай свядомасцю, здольных абараніць сваю Радзіму ад пагроз сучаснасці. Дзеючы праект адлюстроўвае падрыхтоўку кафедры беларускай мовы да святкавання 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Распрацаваны план мерапрыемстваў да 65-годдзя, які прадугледжвае выкарыстанне розных форм выхаваўчай працы: пошукавую і валанцёрскую дзейнасць, музейныя заняткі, экскурсіі і падарожжы па месцах баявой славы, падрыхтоўку юбілейнага выпуску літаратурнага альманаха, выступленні агітбрыгад, мастацкіх калектываў перад ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны. Праводзіцца пастаянна дзеючы конкурс радаводаў і даследаванняў «Вялікая Айчынная вайна праз лёс маёй сям'і».

Наладжаныя студэнцкія канферэнцыі дазволілі выявіць пераможцаў, працы якіх былі накіраваны на Рэспубліканскі конкурс творчых прац навучэнцаў і студэнтаў па грамадазнаўчых навуках «Вялікая Айчынная вайна ва ўдзячнай памяці беларускага народа». Тэматычная разнастайнасць, глыбокае змястоўнае і фактаграфічнае напаўненне даследаванняў сведчаць аб глыбокай ідэалагічнай сталасці сучаснай моладзі, разуменні імі ролі савецкага народа ў вызваленні Еўропы («Вялікі подзвіг народа», «Маладзечаншчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны», «Вялікая Айчынная вайна вачыма маладых», «Вусная народная творчасць – натхняльнік перамогі» і інш.).

У кастрычніку бягучага года ў Мінску і іншых гарадах краіны праведзены дні памяці, прысвечаныя 65-годдзю знішчэння Мінскага гета. З мэтай засваення важнасці ўрокаў Халакосту выкладчыкамі кафедры наладжана пошукавая і краязнаўчая праца па даследаванні тэмы «Халакост. Гісторыя і сучаснасць. Урокі талерантнасці». Падрыхтаваны праект «Халакост: памяць і перасцярога», у межах якога была праведзена канферэнцыя па згаданай тэме (з удзелам консула Дзяржавы Ізраіль у Беларусі Ігаля Койфмана), арганізавана выстава памяці ў Ізраільскім культурным цэнтры (прадстаўлена 30 творчых праектаў). На Рэспубліканскі конкурс накіравана 19 творчых прац. Па выніках удзелу ў конкурсе званне лаўрэата атрымалі студэнты факультэта выдавецкай справы і паліграфіі Малашук Марыя, Ісаеў Дзмітрый, Шэмель Юлія; Спецыяльнага прыза ўдастоены Адамовіч Вольга, Махлай Ірына, Міхалёнак Анастасія; Дыпломамі ўзнагароджаны Аляксеева Алена, Баханко Таццяна, Брэль Таццяна, Дударэвіч Соф'я, Кавальчук Марына, Кутас Вераніка, Шушкевіч Дар'я. Шэраг студэнтаў атрымалі Пахвальныя лісты. Выхаваўчая праца ў дадзеным напрамку дапамагае лепш зразумець рэаліі нашага часу, развівае талерантныя адносіны да людзей розных нацыянальнасцей, садзейнічае выхаванню грамадзянска-патрыятычных пачуццяў, непрыманню насілля, генацыду.

Патрыятычнае выхаванне – гэта не толькі ўмацаванне гістарычнай памяці, але і сцвярджэнне стваральнай працы беларускага народа па развіцці нацыянальнай эканомікі, захаванні нацыянальнай культуры. 2009 год абвешчаны Прэзідэнтам краіны Годам роднай зямлі, што надае новае гучанне дзяржаўным акцыям і праграмам «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся» (стартавала 7 чэрвеня 2006 г. у горадзе Крычаве Магілёўскай вобласці), «Моладзь Беларусі», «Маладыя таленты Беларусі», выкананне якіх з'яўляецца прыярытэтным у галіне ідэалагічнага выхавання моладзі. Распрацоўка такіх праектаў, як «Беларусь – краіна тваёй будучыні», летапіс «Камсамол БДТУ ў асобах і справах», «БДТУ і яго роля ў сацыяльна-эканамічным жыцці краіны», правядзенне конкурсаў на лепшую творчую працу «Табой, Радзіма, ганаруся», радаводаў «Гісторыя майго роду ў лёсе Радзімы», распрацоўка лепшага экскурсійнага маршруту па малой радзіме студэнтаў, правядзенне тэматычных выстаў, прысвечаных Году роднай зямлі, Дню маці, экскурсій па роднай зямлі, тэматычных канферэнцый, выступленні агітбрыгад напаўняюць ідэалагічную працу высокім патрыятызмам і тэматычным багаццем.

Пэўныя змены па ўдасканаленні грамадзянска-патрыятычнага выхавання адбываюцца і ў вучэбным працэсе. Так, у адпаведнасці з бягучымі ідэалагічнымі патрэбамі няспынна актуалізуецца змястоўнае напаўненне вучэбных дапаможнікаў па гуманітарных дысцыплінах. Падрыхтаваны адпаведныя вучэбна-метадычныя комплексы.

Вялікая ўвага на кафедры надаецца ўдасканаленню асобы выкладчыка, які павінен быць прыкладам грамадзянскасці і патрыятызму для студэнтаў. Выкладчыкі кафедры няспынна працуюць над

павышэннем свайго прафесійнага майстэрства і паглыбленнем ідэалагічнай свядомасці. Так, напрыклад, дзякуючы руплівай працы кіраўніка літаратурнага клуба «Ветліца», ст. выкладчыка Н. Я. Савіцкай выдадзена 5 выпускаў літаратурнага альманаха «AVE». Рыхтуецца да друку юбілейнае выданне да 65-годдзя Перамогі. Асноўнай задачай літаратурнага клуба «Ветліца» з'яўляецца выкарыстанне творчага патэнцыялу студэнцтва ў ідэалагічнай і выхаваўчай працы універсітэта. Дзейнасць літаратурнага клуба арыентавана на выкананне канкрэтных задач па прапагандзе дзяржаўных моў, нацыянальнай культуры, заснаваных на спрадвечных нацыянальных традыцыях.

Па выніках Рэспубліканскага конкурсу-агляду ідэалагічнай і выхаваўчай працы вышэйшых навучальных устаноў у ліку пераможцаў адзначаны праект «Сям'і маёй пачатак», падрыхтаваны выкладчыкам Т. У. Жукоўскай. Дыплом II ступені Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Спецыяльны прыз часопіса «Роднае слова» – такая высокая адзнака працы выкладчыка, яе ўкладу ў агульную скарбонку перамог універсітэта па выхаванні студэнцкай моладзі. Як кіраўнікі навуковых прац са студэнтамі станоўча сцвердзілі сябе кандыдат філалагічных навук, дацэнт Т. М. Федарцова, ст. выкладчык Р. В. Міксюк, ст. выкладчык Т. А. Казлякова. Іх студэнты неаднаразова атрымлівалі дыпломы Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь I–III катэгорыі. Варта адзначыць найлепшыя вынікі кураторскай дзейнасці выкладчыкаў В. М. Гусевай, Т. У. Жукоўскай, Т. М. Федарцовай, Т. А. Казляковай.

Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што для студэнтаў, якіх навучаюць выкладчыкі кафедры беларускай мовы, стала надзённай патрэбай жыць актыўным жыццём, удзельнічаць у разнастайных праектах, праводзіць даследаванні аб родным краі, малой радзіме, ушаноўваць памяць аб гераічным мінулым нашага народа. Безумоўна, прыкладам для студэнцкай моладзі павінна быць асоба выкладчыка, яго грамадзянская пазіцыя, высокі ўзровень ідэйнай перакананасці, вернасць Бацькаўшчыне.

**Заключэнне.** Выхаванне грамадзяніна Беларусі – дзяржаўная задача. Таму з мэтай стварэння неабходных умоў для фарміравання выхаваўчых сістэм, арыентаваных на развіццё сацыяльна-развітай і творчай асобы, Пастаяннай камісіяй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе падрыхтаваны праект Мадэльнага закона «Аб выхаванні дзяцей і моладзі». Прыняцце такога закона выведзе грамадзянска-патрыятычнае выхаванне на новы, міждзяржаўны ўзровень, што, у сваю чаргу, запатрабуе ад педагогаў больш шырокага і прафесійнага разумення сваіх абавязкаў па выхаванні моладзі.

Такім чынам, грамадзянска-патрыятычнае выхаванне – гэта працэс, заснаваны на агульначалавечых каштоўнасцях. Да прыярытэтных каштоўнасцей беларусаў адносяць беларускую дзяржаўнасць, веданне ўласнай гісторыі і нацыянальных звычаяў, культуры і мовы. Паводле нямецкага мовазнаўцы і філосафа Вільгельма фон Гумбальта, «мова народа ёсць яго дух, і дух народа ёсць яго мова, і цяжка ўявіць сабе штосьці больш тоеснае». А яшчэ – агульначалавечыя ідэалы дабра, праўды, справядлівасці. Усё гэта складае грамадзянскасць і патрыятызм, якія з'яўляюцца неабходнай умовай дабрабыту і стабільнага развіцця кожнага народа.

## Літаратура


1. Концепция воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь // Настаўніцкая газета. – 2000. – 22 февраля.

2. Непрерывное воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь. Концепция, Программа на 2006–2010 годы. – Минск: НИО, 2007. – 64 с.

3. Буткевич, В. В. Гражданское воспитание детей и учащейся молодежи: пособие для руководителей учреждений образования, педагогов, классных руководителей и студентов / В. В. Буткевич. – Минск: НИО, 2007. – 280 с.